ВОДГУК
на аўтарэферат дысертацыі
Сініла Анатоля Мікалаевіча
"Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных
калекцый музеяў Мінска",
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Тэма дысертацыі А.М.Сініла "Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска" адпавядае спецыяльнасці, па якой яна прадстаўлена да абароны. У аўтарэфераце адлюстроўваюцца тэмы, якія разглядаюцца і з'яўляюцца праблемнымі для мастацвазнаўчай навукі. Аўтарэферат змяшчае асноўныя палажэнні і змест дысертацыйнай працы прапанаванай для абароны. Як вынікае з аўтарэферата, асноўныя палажэнні працы адлюстраваны ў вялікай колькасці публікацый, абмяркоўваліся на шматлікіх канферэнцыях, у тым ліку міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўняў.

Даваенныя (з 1920-ых да пачатку 1940-ых гадоў) зборы жывапісу ў Мінскім сацыяльна-гістарычным музеі (каля 800 карцін) і Дзяржаўнай карціннай галерэя БССР (больш за 1000 работ) былі багатымі не толькі па колькасці, але і па жанравай, сюжэтнай тэматыцы, змяшчалі працы прадстаўнікоў розных нацыянальных школ ад XVI да XX стст. Праз ліхалецце вайны і іншыя трагічныя падзеі захавалася прыкладна 100 карцін. Страчана вялікая колькасць каталогаў, фотаматэрыялаў і іншай архіўнай дакументацыі, што ўскладняе альбо, у шмат якіх выпадках, робіць амаль немагчымым пошук звестак і аднаўленне сюжэтна-тэматычных асаблівасцей жывапісу з даваенных калекцый згаданых музеяў Мінска. Тым не менш, аўтар дысертацыйнай працы ўпершыню ў гісторыі беларускага мастацвазнаўства выявіў і сістэматызаваў жанравую структуру і тэматычна-вобразныя асаблівасці вялікай колькасці твораў жывапісу з даваенных калекцый. А.М.Сініла здзейсніў вялікі аб'ём пошукавай архіўнай і аналітычнай працы па ідэнтыфікацыі твораў, іх аўтарства, стварыў базу пазначэнняў на працах жывапісу, увёў у навуковы ўжытак звесткі пра шмат якія карціны беларускай калекцыі, атрыбутаваў больш за 100 раней невядомых жывапісных твораў з даваенных збораў.

У дысертацыі, акрамя прапанаваных распрацовак па гістарыяграфіі, методыцы даследаванняў, сістэматызавана і прааналізавана жанравая структура твораў беларускага жывапісу, асаблівасці твораў жывапісу гістарычнага, бытавога і пейзажнага жанраў XIX – першай паловы XX стст. Аўтар разгледзеў тэматыка-вобразныя асаблівасці твораў замежнага жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў, вылучыў этапы фарміравання калекцый, адзначыў і абгрунтаваў прадстаўленасць у калекцыях твораў галандскіх, італьянскіх мастакоў, а таксама фламандскіх, нямецкіх, французскіх мастацкіх школ, рускага жывапісу XIX ст. Паказана і абгрунтавана вялікая жанравая, тэматычная, рознага нацыянальнага і стылёвага паходжання разнастайнасць жывапісных прац, што дазваляе зрабіць выснову пра ўнікальнасць і багацце зніклых калекцый.

Праца А.М.Сініла несумненна з'яўляецца самастойным і завершаным даследаваннем. Дысертацыя і публікацыі аўтара, акрамя непасрэдна мастацвазнаўчай навукі, могуць паспяхова выкарыстоўвацца спецыялістамі ў гісторыі і тэорыі мастацтва, у музеязнаўстве, у навучанні студэнтаў і напісанні прац па гісторыі беларускага мастацтва, музейнай справы. Асабліва карыснымі вынікі даследчай працы А.М.Сініла павінны быць у пошуках і вяртанні вялікай колькасці страчаных даваенных калекцый.

Дысертацыя А.М.Сінілы, прадстаўленая на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура, адпавядае ўсім неабходным патрабаванням, а яе аўтар заслугоўвае прысваення іскомай ступені па заяўленай спецыяльнасці.

Дазваляю размясціць мой водгук на сайце ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі".

Кандыдат гістарычных навук,
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела
археалогіі першабытнага грамадства
Інстытута гісторыі НАН Беларусі

М.М. Крывальцэвіч

Подпіс Крывальцэвіча М.М.
Вяд. спецыяліст па кадрах
01 . 06 . 26